БЕЛАРУСКІ КАЛЕКЦЫЯНЕР

№1 (16) люты 1998 г. Кошт свабодны

СТАРОНКІ З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛАТАРЭІ

Шмат хто з калекцыянераў - баністаў, акрамя зьбіраньня папяровых грошай, цікавіцца і латарэйнымі білетамі. Пра гісторыю латарэі і латарэйных квіткоў на Беларусі мы ведаем вельмі мала. У першую чаргу, напэўна, таму, што беларускія калекцыянеры па ранейшаму вельмі мала цікавяцца роднай гісторыяй. У справе зьбіраньня і вывучэньня беларускіх латарэйных квіткоў мы паспрабуем зрабіць першыя крокі.


У Віцебску пад час рэстаўрацыі гарадской ратушы было знойдзена шмат старых папер, якія датуюцца 20-30 гадамі XIX стагодзьдзя. Сярод гэтых папер быў выяўлены квіток (фота 1), які, напэўна, і трэба лічыць першым беларускім латарэйным білетам. Гэты шэры аркуш паперы, які на адваротным баку захаваў прозвішча свайго ўладальніка, мае парадкавы нумар 23. Можа быць, гэта той самы білет, на які выпаў выйгрыш.

А вось перад намі (фота 2,3) яшчэ адзін латарэйны квіток. Ён быў выдадзены менскім таварыствам прыхільных дзяцей у 1928 годзе накладам 10000 паасобнікаў. Білет памерам 16,5х11,5 см. Гэты квіток, надрукаваны чырвонай фарбай на белай паперы, нясе вельмі шмат інфармацыі, толькі трэба ўважліва ўгледзіцца ў яго і крышачку ведаць нашую гісторыю. Трэба адзначыць, што таварыства прыхільных дзяцей выпускала і дабрачынныя маркі.

У Маскве мне пашчасьціла ўбачыць два латарэйных квітка, выробленых у Гомелі ў 1918-30 гадах. Маскоўскі калега за іх прасіў даволі вялікія для мяне грошы. Таму набыць мне іх не ўдалося. Гэтыя квіткі былі выпушчаныя гомельскім таварыствам сяброў паветранага флоту.

Латарэйныя квіткі - сьведкі мінулага і нашага часу. Гэта нашая гісторыя, якая павінна зьбірацца і вывучацца.

А.С.


Билѣты

N-о 23

Разыгрываются въ Лотареѣ Дрожки Рисорныя прочныя хорошаго фасону на Смоленской улицѣ въ домѣ Николая Болюкѣвича цѣна билѣтамъ пять рублей.

Фота 1

АД РЭДАКЦЫІ.

У лістападзе 1990 года ў Воршы выйшаў першы нумар газеты "Беларускі калекцыянер". З таго часу ўдалося выдаць 15 нумароў гэтага выданьня. Апошнія чатыры нумары былі выдадзены ў Менску спадаром Уладзімірам Цярохіным.

Газета займела сваіх прыхільнікаў, сталых чытачоў і карэспандэнтаў. Упершыню ў гісторыі Беларусі зьявілася выданьне, якое асьвятляе пытаньні калекцыянаваньня і вывучэньня памятак нашай гісторыі.

Наша гісторыя дае нам сілы для адраджэньня нашай краіны. На старонках газеты "Беларускі калекцыянер" гістарычная тэма стала бадай самай галоўнай.

"Беларускі калекцыянер" зноў пачынае выходзіць у Воршы. Спадзяёмся, што з Божай ласкі будзем сустракацца часьцей, чым у мінулыя гады.

Алесь Сярожкін.



Фота 2

УМОВЫ ЛЁТАРЭІ, ЗАЦЬВЕРДЖАНЫЯ ПРАЎЛЕНЬНЕМ Т-ва „ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ"

Усяго выпушчана 10.000 білетаў, каштоўнасьцю па 50 кап. кожны, усяго на суму 5.000 руб.

Тэрмін рэалізацыі па 1-ае кастрычніка 1928 г.

Сумы, якія выручаны будуць ад лётарэі, паступаюць у распараджэньне Т-ва „Прыхільнік Дзяцей" на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю.


ВЫЙГРЫШЫ.

Колькь. выйгр.	НАЗВА ВЫЙГРЫШАЎ	Колькь. выйгр.	НАЗВА ВЫЙГРЫШАЎ
2	Ложкі (коваткі) нікеляваныя дзіцяч.	[illegible]	Гарнітуры чайныя
[illegible]	Машына швейная ножная	30	Галёшы
[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
[illegible]	Гарнітуры мужчынскія	[illegible]	[illegible]
[illegible]	Паліто жаночые	10	[illegible] мужчынскія
[illegible]	Самавары нікеляваныя	15	Адрэзы мануфактуры
[illegible]	[illegible]	10	Коўдры дзіцячыя
[illegible]	Штаны мужчынскія	[illegible]	[illegible]
[illegible]	Самабранкі [illegible]	[illegible]	[illegible]
[illegible]	[illegible]	30	Радыё-прыёмнікі
		10	[illegible]
		10	[illegible]

Усяго 207 выйгрышаў на суму 2000 руб.

Фота 3

НОВЫЯ ЗНАХОДКІ



Калекцыянеры-краязнаўцы сёньня знаходзяцца ў больш прывілеяваным стане ў параўнаньні зь іншымі калегамі. Нават сёньня мы маем магчымасьць папаўняць свае зборы. Нас цікавіць любая рэч, што тычыцца нашай роднай бацькаўшчыны, няхай гэта будзе фатаздымак, паштоўка, дакумент, адзнака.

Пасьля публікацыі майго артыкулу пра палескіх стральцоў у мясцовым друку, я меў тэлефонную гутарку, зь якой даведаўся, што ў Пінску жыве яшчэ адзін чалавек, які мае дачыненьне да апісаных мной падзеяў. Хутка адбылася сустрэча. Перада мной жыхар Пінска Сяргей Сяргеевіч Шахновіч, 1916 году нараджэньня. Добры, спакойны, прываблівы твар чалавека, за плячыма якога...

У 1938 годзе С. Шахновіч прызываецца у 84 полк стральцоў для праходжаньня вайсковай службы. Атрымаў спецыяльнасьць сувязіста. У пачатку другой сусьветнай вайны, з 2 верасьня па кастрычнік 1939 году, ён удзельнік той кароткай, але жорсткай вайны у складзе Войска Польскага. Крывапралітныя цяжкія баі пад Чанстаховай, адступленьне, здача зброі, савецкі палон пад Ковелем, уцёк з палону у Лунінцы, вяртаньне дадому. Думалася: вось і ўсё, пачнецца жыцьцё. Але... У сакавіку 1941 году С. Шахновіч прызываецца на шасьцімесячныя зборы ў Савецкую Армію. 25 чэрвеня 1941 году пад Беластокам ён трапляе ў нямецкі палон. Пачаўся найцяжэйшы пэрыяд жыцьця С. Шахновіча, які скончыўся толькі 10 красавіка 1945 году, калі яго з лягеру Кюстрын 3-"с" вызвалілі савецкія войскі. Тут жа ён прызываецца ў Савецкую Армію, як кажуць, з агню дый у полымя. Вярнуўся С. Шахновіч у Пінск толькі ў 1946 годзе, дзе яго ўсе гэтыя гады чакала жонка. Так, пражыць усё гэта аднаму чалавеку не пад сілу, а ён - пражыў. Ішоў час, чалавек жыў, таіў сваё мінулае. Не адбылося зьменаў і пасьля таго, калі у 1985 годзе ~~Савецкі~~ ўрад узнагародзіў С. Шахновіча і такіх, як ён, медалём "За абаронную вайну 1939", іх запаважалі. Што ж, "перабудова" была ў апагеі.

Другая знаходка тычыцца таксама чалавека, якога, на жаль, ужо няма сярод нас. Ураджэнец вёскі Баяры, што на Піншчыне, Шаламіцкі Фелікс праходзіў службу ў 84 палку палескіх стральцоў у пачатку трыццатых гадоў. Пра гэта сьведчыць пасьведчаньне аб заканчэньні ім у 1932-1933 гг. школы падафіцэраў пры гэтым жа палку й атрыманьні намінацыі старэйшага стралка (здымак 2). Дарэчы, пасьведчаньне падпісана знакамітым камандзірам палка Тунгушам-Зьвісьляком. Ф.Шаламіцкі ня толькі вельмі добра вучыўся, але й добра служыў, аб чым

сьведчаць яго ўзнагароды (здымак 3). Сярод іх (зьлева ўнізе) даволі рэдка сустракаемая цяпер адзнака "Выдат-



Lp. 16/61

ŚWIADECTWO

strzel. Szołomicki Feliks URODZONY DNIA 1910 R.
W Bojarach POWIATU Pińskiego WOJEWÓDZTWA Poleskiego
UKOŃCZYŁ W CZASIE OD DNIA 15. V 1932 R. DO DNIA 1 ... 19... R.


SZKOŁĘ PODOFICERSKĄ

w 84 pułku piechoty w Pińsku


Z WYNIKIEM ... I OTRZYMAŁ NOMINACJĘ NA ...

HONOR ... WOJENNYM

ны стралок". Але найбольшую цікавасьць выклікае так званая фрачная адзнака (зьлева ўверсе) з абрыэвіятурай і выявай чырвонага эмалевага шчупака ў сярэдзіне літары. Адзнака зроблена фірмай С.Рэйсінга ў Варшаве. Цікавая яна, на маю думку тым, што зьяўляецца адзнакай члена Саюза палякаў Палесься. Астатнія адзнакі добра вядомыя калекцыянерам-паланістам - стралковая адзнака 2 ступені і адзнака палку.



Наша беларуская зямля багатая скарбамі. Пра гэта сьведчыць і падзея, якая адбылася 24 кастрычніка 1995 году ў Пінску падчас археалягічных раскопак на рагу вуліц Завальнай і Бялова (былая Крулевы Боны). Раскопкі праводзіліся пад наглядам доктара гістарычных навук П.Ф.Лысенкі. Пад час земляробных работаў коўш экскаватара падняў на паверхню зямлі скрыню, якая нечакана развалілася і на зямлю пасыпаліся шматлікія рэчы. Як пазьней высьветлілася, зьмесьціва скрыні цалкам складалася з вайсковых адзнак і фарнітуры (здымак 4). Паспрабуем высьветліць, як апынуўся гэты скарб у адзначаным мейсцы, а потым зьвернемся да яго зьмесьціва. На гэты конт у мяне ёсьць дзьве версіі. Першая зьвязаная з тым, што падчас адступленьня жаўнераў 84 палку ў верасьні 1939 году зь Пінска, штаб палку, які знаходзіўся недалёка, у якіх дзьвюх сотнях метраў, на вуліцы Касьцюшкі (цяпер Леніна), быў абрабаваны адным зь мяйсцовых жыхароў. Каштоўнасьці былі захаваныя дома. І другая, найбольш верагодная: адзін з афіцэраў палку атрымаў загад схаваць палкавыя каштоўнасьці да лепшых часоў. Лепшага мейсца, чым дом, дзе ён, кватараваў, пад імклівым наступам савецкіх войскаў не атрымалася знайсьці. Так, мажліва, скарб апынуўся ў жылым доме і выявіўся больш чым праз 55 гадоў. Што да зьмесьціва скарбу, то яго большасьць складалі адзнакі 84 палку палескіх стральцоў, зробленыя фірмай В.Гантарчыка ў Варшаве (на здымку пасярэдзіне). Па маіх падліках іх было ад 100 да 150. Восем зь іх трапілі ў музей Беларускага Палесься, астатнія разыйшліся і знайшлі свой прытулак у аматараў гісторыі. Шмат было гузікаў, какард розных спосабаў мацаваньня, адзнак польскай арганізацыі спартовай (PO) (зьлева), стралковых адзнак 1 і 2 ступеняў (унізе зьлева й справа). У скарбе было некалькі медалёў "За шматгадовую службу" - за 10 гадоў бронзавы (зьлева) і 20 гадоў-срэбны (на здымку адсутнічае). Было таксама некалькі фрачных стралковых адзнакаў 1 ступені (ніжэй сярэдзіны). Усё гэта добра вядомыя калекцыянерам рэчы. Але ёсць адзнакі, якія выклікаюць пэўную цікавасьць. Гэта пятлічныя адзнакі з выявай чароту - сімвалу палку (зьлева й справа ўверсе), а таксама адзнака аб заканчэньні палкавой школы падафіцэраў (справа). Пэўную цікавасьць выклікае адзнака кампаніяў штурмовых з выявай палаючай гранаты (унізе). У скарбе таксама былі металічныя лічбы 84 і 3 на пагоны (на здымку няма). Некаторыя адзнакі, выробленыя фірмай Грабскага з Лодзі. На маю думку, гэты скарб выклікае цікавасьць сваёй паўнатой вайсковай атрыбутыкі.



Выказваю падзяку ўсім, хто дапамог у зборы матэрыялу, асабліва А.Васільеву й Я.Балуку.

Яўген Гурэўскі.

Сьпецыяльныя гашэньні пошты Рэспублікі Беларусь за 1996 год



№1



№2



№6



№7



№9




№№3,4,5,8,10,12,13,15



№11



№14



№16

№1 6.02.1996 г. Жывёльны сьвет Беларусі. Менск. Чорны сьпецыяльны канверт.
№2 5.03.1996 г. 100 гадоў з дня нараджэньня Кандрата Крапівы. Першы дзень. Чорны. Сьпецыяльны канверт.
№3 26.03.1996 г. Бобр (блёк). Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№4 29.03.1996 г. Матылькі Беларусі. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№5 10.04.1996 г. 10 гадоў Чарнобыльскай трагедыі. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№6 23.05.1996 г. Рэспубліканская нарада работнікаў сувязі. Белпошта. Вілейка. Чорны. (На шляху зь Вілейкі ў Менск штэмпель быў зьнішчаны агнём у час авіякатастрофы.)
№7 4-7.06.1996 г. 3-я Міжнародная сьпецыялізаваная выстава і кангрэс (BBB-TIBO). Менск. Чорны.
№8 14.06.1996 г. Дагавор пра ўтварэньне супольнасьці паміж Рэспублікай Беларусь і Расейскай Фэдэрацыяй. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№9 19.07.1996 г. 26 Летнія Алімпійскія гульні. Атланта-96. Менск. Чорны. Спецыяльны канвэрт.
№10 13.08.1996 г. Беларускі нацыянальны строй. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№11 15.08.1996 г. Лекавыя расьліны. Менск. Чорны. Сьпецыяльны канверт.
№13 19.09.1996 г. 400 гадоў граматыцы Лаўрэнція Зізанія. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№14 24.09.1996 г. Шэдэўры беларускай архітэктуры. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводннай датай.
№15 9.10.1996 г. Сусьветны дзень пошты. Блакітны. Канвэрты з гэтым сьпецыяльным штэмпелем прадаваліся 9 кастрычніка на ўсіх вузлах сувязі буйных гарадоў рэспублікі.
№16 16.10.1996 г. 100 гадоў з дня нараджэньня беларускага навукоўца-мастацтвазнаўца М. М. Шчакаціхіна. Менск. Чорны. Штэмпель "Першы дзень" з пераводнай датай.
№17 14.11.1996 г. 100 гадоў Менскай гарадзкой тэлефоннай сетцы. Менск. Чорны. Сьпецыяльны канверт.
(Адсутнічаюць зьвесткі па Берасьцю.)

Лeў Коласаў

ЗАБЫТЫЯ ГРОШЫ

На пачатку гэтага месяца Расія аб'явіла аб правядзенні дэнамінацыі. Беларускі прэзідэнт амаль што адразу адгукнуўся заявай, што Беларусь па расійскаму шляху не пойдзе. Такім чынам, нам давядзецца яшчэ невядома колькі часу карыстацца шматнулявымі каляровымі паперкамі нізкага кошту. А між тым у сховішчах Нацбанку Беларусі ўжо пяць гадоў пыляцца ўсімі забытыя беларускія грошы. Сапраўдныя грошы.

Разам з гербам, сцягам і гімнам нацыянальныя грошы з'яўляюцца адным з неабходных атрыбутаў. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларускай дзяржавы адразу паўстала пытанне аб стварэнні беларускіх грошай. Не гэтых разліковых білетаў (г.зв. "зайчыкаў", якія, дарэчы, былі створаны не для замены, а для дапаўнення савецкіх рублёў у якасці купонаў), а сапраўдных грашовых адзінак.

У 1992 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі на закрытым паседжанні зацвердзіў узоры сапраўднай беларускай валюты. Было вырашана захаваць за ёй назву "рубель" У вельмі кароткі тэрмін (каля 9 месяцаў) на спецыяльнай фабрыцы ў Германіі быў надрукаваны тыраж беларускіх рублеў Ён складаўся з банкнотаў наміналам 1,5,10,50 і 100 рублёў, эскізы якіх былі падрыхтаваныя ў Беларусі і змяшчалі выяву найбольш знакамітых асобаў беларускай гісторіі і культуры :Францішка Скарыны, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Цёткі, а таксама адметных помнікаў беларускай архітэктуры. Па словах Станіслава Багданкевіча, былога старшыні Нацыянальнага банка, банкноты мелі 12 ступеняў аховы і каштавалі падаткапла-цельшчыкам каля 20 мільёнаў долараў. Агульная грашовая маса складала каля 300 мільёнаў рублёў. Быў намер зрабіць беларускі рубель дарагой валютай, каб ён каштаваў каля 1 долара ЗША. Для разлікаў меншых маштабаў меркавалася ў першыя часы карыстацца "зайчыкамі", а потым адчаканіць манеты ў самой Беларусі.

Але новую валюту нельга было ўводзіць з-за вялікай інфляцыі, якая хутка абясцэніла яе. Таму з мэтай спынення інфляцыі Нацбанк пачаў праводзіць даволі паспяховую грашова-крэдытную палітыку. У выніку яе ў 1995 годзе ўжо было больш выгадным утрымліваць рублі, чым долары. Але Нацбанк не можа сам змагацца з крызісам вытворчасці, ствараць спрыяльныя ўмовы для паспяховай працы прадпрыемстваў. Гэта справа ўрада. Урад не здолеў тады падтрымаць грашовую палітыку Нацбанка, і ўвядзенне новых грошай было адкладзена.

Новыя грошы да гэтага часу ляжаць у сховішчы Нацбанка ў Мачулішчах пад Мінскам, і ў бліжэйшы час нельга чакаць іх увядзення. Як сцвярджае С. Багданкевіч, для таго каб стварыць спрыяльныя ўмовы для грашовай рэформы, трэба плённа працаваць на працягу 6-8 месяцаў. Але гэта магчыма толькі тады, калі ў Беларусі будзе дэмакратычны і эканамічна падрыхтаваны ўрад, лічыць С. Багданкевіч. Зразумела, што такі ўрад мы будзем чакаць вельмі доўга. Па ацэнках іншых спецыялістаў, на ўвядзенне новых грошай спатрэбіцца 12 месяцаў. Акрамя таго, на тых грошах прысутнічаюць яшчэ сапраўдныя беларускія сімвалы, якія так не падабаюцца цяперашняму рэжыму. Таму іхняе з'яўленне ў кішэні беларускага народа здаецца вельмі малаверагодным.

Пра новыя беларускія грошы ёсць шмат рознай інфармацыі, часам нават супярэчлівай. Такія рэчы, як грашовая рэформа, з'яўляюцца дзяржаўнай таямніцай. Усё пра беларускія грошы ведае, здаецца, толькі адзін чалавек — Валянцін Заяш, былы намеснік старшыні Нацбанка Беларусі, які займаўся ўсёй тэхнічнай падрыхтоўкай праекта. Але ён адмаўляецца размаўляць пра беларускія грошы, бо лічыць сябе звязаным гэтай самай таямніцай. Таму новыя чуткі пра беларускія грошы толькі множацца.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ.
(СВАБОДА № 93)

ЦІКАВАЯ ЗНАХОДКА


Нядаўна у Слоніме была знойдзена досыць рэдкая грашовая купюра - 2 грыўны Украінскай Народнай Рэспублікі 1918 года. Крэдытны білет зялёнага колеру і толькі серыя і нумар выкананы чырвонам. Ён добра захаваўся й мае памеры 10,8см х 6,9см.

Цяжка сказаць, як трапілі гэтыя 2 грыўны ў Слонім. Вядома, што Урад БНР меў добрыя палітычныя й эканамічныя стасункі з Урадам УНР. У 1919 годзе Урад Луцкевіча атрымаў вялікую грашовую пазыку ад Урада Пятлюры ў марках, кронах і магчыма ў грыўнах.


Аднак найбольш верагодней, што купюра трапіла на Слонімшчыну прыватным чынам і захавалася дзякуючы беражлівасьці свайго ўладальніка, які трымаў яе сярод царскіх банкнот і керанак.

Сяргей ЁРШ





Ордэн " ГОНАР АЙЧЫНЫ "



Пакуль адны беларусы плачуць і пішуць лісты ва ўсе ўстановы свету, каб ім дазволілі размаўляць па-беларуску, а другія ў сваіх халуйскіх памкненьнях хочуць быць больш рускімі за саміх рускіх, знаходзяцца людзі, якія ствараюць Беларусь і жывуць у ёй.

Менскі клюб "Спадчына" на чале з А. Белым стварыў "Камітэт па ўзнагародам". Камітэт мае мэту адзначаць лепшых людзей Беларусі. Прэзыдэнт Лукашэнка, трэба аддаць яму належнае, вельмі хутка вырабіў свае ўзнагароды і шчодра іх раздае. Але чаго варты ордэн Францішка Скарыны, які мае надпіс Францыск Георгій Скарына. Гэта адзнака лепш за ўсё падыходзіць фальсіфікатарам нашай гісторыі і русафікатарам нацыі.

Сёньня мы маем дзьдзве Беларусі. Беларусь савецкую і Беларусь беларускую. Другая Беларусь мае сваю першую ўзнагароду-ордэн "Гонар Айчыне". На ім выява беларускай святыні - крыж Эфрасіньні Полацкай. Ён выраблены са срэбра, аўтар Юрый Гудзіновіч.

Практыка альтэрнатыўных узнагарод даўно вядома ў сьвеце. У нас на перадзе юбілей. Мінула 80 гадоў з дня абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі. Юбілейны медаль да гэтай падзеі быў бы вельмі дарэчы.

Першая марка Рэспублікі Беларусь.



Як вядома, першая паштовая марка Рэспублікі Беларусь была выпушчаная 20 сакавіка 1992 года. Але ў маёй калекцыі на першым мейсцы стаіць марка СССР 1988 года, прысьвечаная 500-ым угодкам з дня нараджэньня Францішка Скарыны, з чырвонай наддрукоўкай слова "Беларусь" . Адразу адзначым, што дзяржава, якая завецца Рэспублікай Беларусь, да гэтай наддрукоўкі не мае ніякага дачыненьня. Дый што можна было чакаць у верасьні 1991 года ад дзяржавы, якая праводзіла антыбеларускую палітыку? Пасьля абвяшчэньня Незалежнасці чыноўнікі ад пошты амаль цэлы год карысталіся маркамі ужо неіснуючай імпэрыі. Натуральна, гэта было ненармальнае становішча. Але што было рабіць.

Стаміўшыся чакаць беларускіх паштовых марак, у верасьні 1991 года ў Воршы вырашылі зрабіць наддрукоўку "Беларусь" на марках СССР. Пасьля некалькіх пробных наддруковак на розных марках СССР было вырашана спыніцца на марцы з выявай Францішка Скарыны. Наддрукоўка рабілася ўручную чырвонай фарбай. Праз пошту пайшло ня больш як 300 паасобнікаў. А ўсяго было 50 артыкушаў па 21 марцы ў адным артыкушы. Праўда, частка марак была сапсаваная і зьнішчаная. Маркі выкарыстоўваліся да зьяўленьня афіцыйных адзнакаў беларускай пошты. Да гэтай зьявы можна ставіцца па-рознаму, але ж гэта частка гісторыі беларускай філятэліі.

Алесь Сярожкін
Ворша

Самыя—Самыя...

* * *

Якіх толькі "рэкардсменаў" няма ў сьвеце: сярод паштовых марак, манэтаў, паштовак, асыгнацыяў і іншых прадметаў, якія беражліва зьбіраюцца й захоўваюцца калекцыянерамі! Гэтыя "вышэйшыя дасягненьні" не рэгіструюцца, праўда, у "кнізе рэкордаў Гінеса", (якая штогод выдаецца ў Англіі.) Але ж вельмі цікава даведацца, пра што менавіта ў сьвеце калекцыяў можна сказаць — гэта самае-самае...

* * *

Самыя-самыя драўляныя маркі выдала пошта Габона. Сюрпрыз чакаў філятэлістаў — у пачатку 80-х гадоў пошта гэтай краіны вырашыла яшчэ раз уразіць калекцыянераў: да Дня Незалежнасьці была выпушчыная драўляная марка. Праўда, на канвэрт яе не прыклееш. Аднак попытам гэтая маркі карысталіся вялікім. Пошта Габона да драўлянай маркі выпускала мініяцюры на залатой і алюмінавай фальзе, на дэдэронавай аснове. Філятэлісты ахвотна папаўняюць свае калекцыі зацейлівымі выдумкамі вынаходлівай паштовай службай Габона.

* * *

Доўга лічылася, што кітайская марка 1913 года памерам 25 х 7см — самая вялікая ў сьвеце. Але ў 1980 годзе пошта Маршалавых выспаў пабіла гэты рэкорд, выпусціўшы марку памерам 16 х 11см. Нескладаны падлік паказвае, што плошча маркі з далёкай выспы на цэлы квадратны сантыметр перавышае квадратуру старэнькай кітаянкі.

* * *

Самы першы перавод грошай па пошце быў зроблены ў Англіі ў 1792 годзе. Да гэтага асыгнацыі можна была перасылаць толькі ў шчыльных папяровых канвертах, а звонкую манету — у скураных мяшэчках ці ў дубовых бочачках.

* * *

Самы першы паштовы штэмпель быў уведзены ў Англіі ў 1661 годзе. Ён меў форму кола, ў якім абазначаліся дзень і месяц здачы ліста на пошту.

* * *

Самая першая паштоўка зьявілася ў Аўстра-Венгрыі ў кастрычніку 1869 года, называлася яна карэспандэнцкай карткай і не магла быць перасланая за межы краіны. Толькі праз 6 гадоў паштовыя карткі сталі прымацца і для міжнароднай перапіскі. У Расейскай імпэрыі маркіраваныя паштоўкі зьявіліся ў маі 1872 года.

* * *

Самы нізкі намінал быў абазначаны на паштовай марцы Індакітая ў 1931 годзе — усяго адна дзесятая цэнта.

Сабраў А. Рыбчынскі,
г. Менск


Яшчэ раз пра слуцкія маркі.


У "Беларускім калекцыянеры" за 1990 г. (№1) быў зьмешчаны невялікі артыкул "Маркі слуцкага паўстаньня". У гэтым матэрыяле ёсьць некалькі недакладнасьцяў, якія ўводзяць філятэлістаў у зман. Таму мне хацелася б унесьці некаторыя карэктывы, тлумачэньні у той артыкул з "БК" №1.

Аўтар артыкула сьцвярджае, што пра маркі слуцкага паўстаньня стала вядома зусім нядаўна. Гэта не зусім так. Філятэлістам вядома пра гэтыя маркі яшчэ па публікацыям 1921 года, і па саміх марках у калекцыях. Зразумела, я маю на ўвазе ту частку філятэлістаў, якія цікавіліся выпускам розных марак перыяду 1917 — 1922 г.

У 1921 годзе ў часопісе "Polski Filatelista" (№4) быў зьмешчаны артыкул пра слуцкі выпуск, а ў 1935 годзе пра гэта выданьне паведамлялася ў манаграфіі "Польскі паштовы знак" (ППЗ). Пасьля другой сусветнай вайны у 1966 годзе гэта манаграфія была ўдакладнена, дапоўнена і перавыдана. У IV томе "ППЗ" у раздзьдзеле "Varia" (ст.1521) паведамляецца пра слуцкі выпуск.

Год выданьня гэтых марак - 1921. Што ж уяўляюць сабой маркі слуцкага паўстаньня? На польскіх паштовых марках выпуска 1919 года была зроблена ручная наддрукоўка гумавым штэмпелем, чорнай фарбай ў тры радкі — новы намінал, беларуская Пагоня і літары "Ч.Р.Сл." — Чрэзвычайная Рада Случчыны. Аўтар артыкула ў "БК" піша, што наддрукоўка зроблена на "старых запасах расійскіх марак" і што наддрукоўка зроблена "лацінкай". Як бачым, гэта не зусім так. Былі скарыстаны польскія маркі і наддрукоўка зроблена кірыліцай.





Новы намінал -"25" і "50" капеек. Усяго было тры віда наддрукован (усе у зубцовым вырыянце): 25 капеек на зялёнай марцы ў 5 гелераў, 50 капеек на жоўтай марцы ў 10 гелераў і 50 капееек на чырвонай марцы ў 15 гелераў .Маюцца зьвесткі (акрамя ППЗ), што была яшчэ адна чацьвёртая марка -50 капеек на ружовай марцы ў 15 пфенінгаў. Тут трэба патлумачыць, што польская пошта ў 1919 годзе (17.01 і 27.01) выпусьціла дзве серыі марак (аднолькавага наміналу) для регіёнаў Польшчы, былых раней пад Аўстрыйскай і Нямецкай акупацыяй, у рознай валюце. Для першага рэгіёну ў карона - гелеравай валюце , для другога - у марка - пфенінгавай. У польскай прэсе 1921 года былі зьмешчаны выказваньні аднаго з сяброў Рады (Рада месьцілася ў той час у Варшаве ў гатэлі , Saski, у пакоі №8) па выпуску слуцкіх марак. Зь яго слоў маркі гэтыя былі падрыхтаваны ў якасьці марак аплаты за дастаўку лістоў у Слуцку. Тры варыянта марак вядомы з перавёрнутымі наддрукоўкамі. У паштовым ужытку гэтыя маркі ніколі не былі. Хаця яны сустракаюцца на канвертах і на паштоўках быццам бы прашоўшыя пошту. Вядома ўсяго некалькі такіх незвычайных сувэніраў. У якасьці ілюстрацыі такога сувэніру ў ППЗ (ст.1521) падаецца картачка з двумя маркамі "Ч.Р.Сл." пагашаных польскім паштовым каляндарным штэмпелем, Baranowicze *b* з датай 21.01.21 г. У філятэлістычнай літаратуры гэтыя канверты і карткі вызначаюцца, як спекулятыўныя і фантастычныя выданьні, зробленыя філятэлістамі і рознымі дзялкамі ад філятыліі таго часу. Адзначаецца таксама, што польскія паштовыя ўлады не маглі дазволіць хаджэньне карэспандэнцыі з такімі маркамі, тым больш, што польская пошта ў той час мела дастаткова сваіх марак.

Са слоў таго ж прадстаўніка Рады — увесь наклад марак быў распрададзены ў Варшаве сябрамі Рады, а прыбытак пайшоў на патрэбы Рады.

Выпуск гэтых марак выклікае шмат пытаньняў у філятэлістаў. Перш за ўсё — дзе гэтыя маркі былі выдадзены, дзе рабілася наддрукоўка? На Беларусі ці за яе межамі? Чаму выкарыстоўваліся маркі ў аўстрыйскай валюце, чаму не былі скарыстаны запасы расійскіх марак? Ці ёсьць дзе-небудзь у архівах дакументы Чрэзвычайнай Рады Случчыны, што тычыцца гэтых марак? Які наклад гэтых марак?

Прайшло 75 гадоў пасьля слуцкіх падзей, але гісторыя марак так і не высьветлена да канца. (Дакладней, гісторыі яшчэ няма, ёсць толькі адрывачныя, неправераныя дадзеныя). На жаль, гісторыкі, што даследваюць і апісваюць тыя падзеі, факт існаваньня марак Чрэзвычайнай Рады Случчыны ніяк не асьвятлілі.

Л. Коласаў,
г. Менск.

ГРАФІЦІ НА БАНКНОТАХ

Слова "графіці" паходзіць ад італьянскага слова "graffito" (надрапаны), якое пазначала старажытныя надпісы галоўным чынам бытавога характару, малюнкі надрапаныя на сьценах будынкаў, платах, сасудах. У 20 стагодзьдзі гэта зьява пашырылася і на грошы. Калі ўважліва праглядзець тыя грошы, што мы кожны дзень трымаем у руках, напэўна, кожны заўважыць на некаторых зь іх розныя лічбы, паметкі, а то і надпісы.

У Расеі ў час выбараў пасьля Лютаўскай рэвалюцыі і пад час грамадзянскай вайны, грашовыя банкноты выкарыстоўваліся ў мэтах агітацыі. На іх рабілі розныя наддрукоўкі. І як паведамляе расейская прэса і сёньня банкноты ў Расеі нясуць на сабе шмат інфармацыі, якая там не павінна быць. У Паўднёвай Карэі ў 80-я гады графіці на банкнотах стала такой распаўсюджанай зьявай, што ўрад вымушаны нават выдаць адмысловы загад, які забараняў прымаць у насельніцтва банкноты з рознымі антыўрадавымі заклікамі. Пачынаючы з вясны 1996 года і на Беларусі пачалі масава сустракацца на банкнотах антылукашкаўскія надпісы. Як адзначаюць касіры беларускіх банкаў і крамаў, праз рукі якіх штодня праходзяць тысячы грашовых адзінак, найчасьцей трапляюцца такія надпісы: "Далоў лукашызм", "Лука - сатана", "Жыве Незалежная Беларусь", а таксама графіці, зробленыя саматробнымі штэмпелямі з выявай Пагоні на 50-і і 100 тысячных купюрах.

Алесь Бараноўскі.

А Б ' Я В Ы

Зьбіраю значкі, маркі, канверты, паштоўкі і іншае пра Чарнобыль. Набуду першыя канверты, прысьвечаныя Віцебску і вобласці. Маю абменны фонд. Беларусь, 210015, г.Віцебск-15, п/с 46, Анатоль Гнеўка.

Цікаўлюся маркамі незалежнай Беларусі, беларускімі вы: мпеламі, паштоўкамі з краявідамі гарадоў Беларусі. У абмен прапаную навінкі марак Украіны. Зьвяртацца на адрас: Украіна, 281200, Хмяльніцкая вобл., г. Ізяслаў, вул. Незалежнасьці, д. 21, кв. 2, Пятрусь Капчык

Украінскі калекцыянер у абмен на ўкраінскія філятэлістычныя матар'ялы (маркі, КПД, СГ) і ХМК СССР жадае набыць філматар'ялы Беларусі і ХМК СССР украінскай тэматыкі.
254208, Украіна, Кіеў, п/с 38. Яўтушэнка А.М.

Шукаю кнігі па нумізматыцы, баністыцы, грашовым абарачэньні.212004, Беларусь, Магілёў, Віцебскі пр-т, 13-5.

ДА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

У Менску "Беларускі калекцыянер" заўжды можна набыць у шапіку Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны: на скрыжаваньні вуліц К.Маркса і Леніна. Час працы з 11.00 па 18.00 гадзін, акрамя нядзелі і панядзелка.

Аб'явы чытачоў па тэматыцы беларускага калекцыянаваньня друкуюцца задарма.

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВЫДАНЬНЯ ПАШТОВЫХ МАРАК РЭСПУБЛІК БЕЛАРУСЬ НА 1998 ГОД

№	Назва	Колькасьць
1	Зімовая алімпіяда ў Нагана	4 м
2	"Сусьветная марка" (Да сусьветнага дня маркі)	1 м
3	Чырвоная кніга Беларусі. Фаўна "Пеўчыя птушкі"	4 м + 1 бл.
4	50 год заводу БелАЗ у Жодзіна	5 м
5	200 год з дня нараджэньня Адама Міцкевіча	1 м
6	775 год заснаваньня г.Нясьвіжа	1 м
7	Нацыянальны мастацкі музэй. Жывапіс Беларусі	5 м
8	З Новым Годам!	1 м

Газета Беларускі Калекцыянер
Год заснавання 1990
Рэдактар Алесь Сярожкін
Вёрстка Сяргей Марусенка

Пры передруку спасылацца на "Беларускі Калекцыянер". Рукапісаў рэдакцыя не вяртае й не рэцэнзуе. Аўтары матэрыялу нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў.

Адрас Рэдакцыі: 211030, Орша, вул. Флёрова 7-16, Беларусь.
Наклад 499 асобн.